Г.М. Мезенка

# Тапонімы, суадносныя з найменнямі жывёлы, як сляды "культурнай практыкі" папярэдніх пакаленняў беларусаў

# Традыцыйныя веды

- З’яўляючыся своеасаблівай этнасацыяльнай памяццю, паняцце «*традыцыйныя веды*» мае самыя разнастайныя вызначэнні.
- Найбольш прымальныя і пашыраныя сярод навукоўцаў наступныя:

# Традыцыйныя веды –

- гэта "нематэрыяльная культурная спадчына", якая ўключае звычаі, формы прадстаўлення і выразы, веды і навыкі, — а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, — прызнаныя супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі асобамі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны

# Вікіпедыя

# Традыцыйныя веды - гэта

- веды,
- ноу-хау,
- навыкі,
- інавацыі або практыкі,
- якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне і фарміруюць частку традыцыйнага ладу жыцця карэнных народаў або мясцовых супольнасцяў .

# Па словах Фікрэта Беркеса,

- «традыцыйныя веды – гэта камбінацыя ведаў і вераванняў пра ўзаемаадносіны жывых істот (у тым ліку людзей) адзін з адным і навакольным асяроддзем, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне праз культуру».

## Рэкамендацыі па захаванню традыцыйных выразаў культуры і фальклору

- **1989 г.**

- **Выяўленне (збор, каталагізацыя, пісьмовая фіксацыя).**
- **Захоўванне (стварэнне архіваў, музеяў).**
- **Забеспячэнне захаванасці (адукацыйныя праграмы і мерапрыемствы, заахвочванне навуковых даследаванняў па захаванні фальклору).**
- **Распаўсюджванне фальклору (садзейнічанне арганізацыі фестываляў, семінараў, канферэнцый).**
- **Ахова фальклору, падобная да аховы, якая прадастаўляецца творам інтэлектуальнай творчасці, а таксама правы носьбітаў фальклору і збіральнікаў фальклору (належнае ўтрыманне калекцый, гарантыя супраць неправамернага выкарыстання і г.д.)**

# Традыцыйныя выразы культуры і фальклор

- паданні,
- песні,
- танцы,
- малюнкі,
- разьбяныя выявы,
- распевы,
- тэатралізацыі,
- фальклор,

прыказкі,
народныя павер’і,
рытуалы,
метады вядзення сельскай гаспадаркі,
уключаючы раслінаводства і
жывёлагадоўлю

# Тапонім --

- уласнае імя прыроднага аб'екта на Зямлі, а таксама аб'екта, створанага чалавекам на Зямлі, які выразна зафіксаваны ў дадзеным рэгіёне (горад, вёска, апрацаваны ўчастак зямлі, тэрыторыя як частка дзяржавы, камунікацыя і да т.п.), у тым ліку гідронім, айконім , спелеонім, урбанонім, аграонім, дрымонім, інсулонім і інш.

# Тапаніміка --

- **раздзел анамастыкі, які вывучае тапонімы, заканамернасці іх узнікнення, развіцця і функцыянавання.**

# Тапанімікон --

- **1. Слоўнік або спіс тапонімаў.**
- **2. Рэпертуар геаграфічных назваў.**

# Беларускія тапонімы звязаны з:

1) фізіка-геаграфічнымі асаблівасцямі і элементамі рэльефу,

2) прыроднымі комплексамі,

3) арэаламі таго ці іншага раслінната ці жывёльнага свету.

## У тапаніміконе Беларусі

- знайшлі адлюстраванне назвы
- рыб,
- птушак,
- дзікай жывёлы.

# Найменні геаграфічных аб'ектаў, матываваныя назвамі жывёлы

- тапонімы, утвораныя ад найменняў жывёлы, тканкі, органы і прадукты жыццядзейнасці якіх прызначаныя для выкарыстання **ў якасці лекаў і ў якасці ежы**;
- тапонімы, утвораныя ад найменняў жывёлы, прызначанай **для гаспадарчых патрэб;**
- тапонімы, утвораныя ад наймення месца, дзе ёсць зручныя / нязручныя **ўмовы для здабычы ежы**;
- тапонімы, утвораныя ад найменняў жывёлы, тканкі, органы і прадукты жыццядзейнасці якіх прызначаныя для выкарыстання **ў якасці ежы**.

# Жывёльны свет Беларусі прадстаўлены вялікай колькасцю рыб

Іх налічваецца больш за 50 відаў.

Па дадзеных навукоўцаў, часцей за ўсё ў беларускіх вадаёмах можна ўбачыць:

шчупака, плотку, краснапёрку,

звычайнага карася, ляшча, верхаводку,

сома, акуня, мянтуза і іншыя віды.

# У тапаніміі

- на першы план выходзяць найменні, утвораныя ад назваў рыб
- ласося,
- мянтуза (меня, менька, менцюка),
- гальца,
- акуня.

## **Лідзіруе па ўжывальнасці** ў якасці асновы тапонімаў і гідронімаў назва рыбы ***ласось***

- Так, назвы рэк сістэм Віліі (*р. Ло'ша*), Нёмана (*р. Ло'ша* і *Ласо'сна*), Лучосы (*р. Ласасі'на*), а таксама вёсак Гродзенскага, Астравецкага, Уздзенскага р-наў (*Ласо'сна, Ло'ша, Лаша'нка, Ло'шыца, Лаша'ны, Ло'шніца*) сваімі асновамі звязаны з найменнямі гэтага віду рыб.
- Ласося лічаць вельмі карысным відам рыбы, ужыванне якой у ежу можа прадухіліць развіццё захворванняў сэрца і шчытападобнай залозы, псіхічных расстройстваў, а таксама аздаравіць арганізм чалавека ўвогуле.

# Блізкую да гэтай пазіцыю дадзены від «рыбных" асноў падтрымлівае найменне рыбы *галец*,

- У мясе гэтай рыбы шмат амега тлушчаў, карысных для мазгоў, якія ўмацоўваюць ахоўныя сілы арганізма і  з'яўляюцца прафілактыкай шмат якіх сардэчна-сасудзістых захворванняў. Калій, які ёсць у рыбе, выводзіць лішнюю ваду з арганізма; вітамін Е, званы яшчэ вітамінам маладосці, з'яўляецца моцным антыаксідантам; селен будзе асабліва карысны для людзей, якія пражываюць у экалагічна забруджаных раёнах або ў мясцовасці, дзе глеба бедная гэтым элементам; вітаміны групы В удзельнічаюць у шматлікіх абменных працэсах арганізма.

# Прыкметна часцей

- у беларускім тапаніміконе ў якасці будаўнічага матэрыялу для найменняў вёсак і рэк выкарыстоўваецца аснова *сліж*-.
- Параўнаем:
- *р. Сліжа'нка* (прыток Іліі, сіст. Віліі), *в. Сліж* 'Лідскага і Шклоўскага р-наў, *в. Слі'жына* Лагойскага р-на, *в. Сліжо'ва* Пастаўскага р-на.

# Назва рыбы *налім*

- у беларускай анамастыцы не задзейнічана,
- «затое мень – вельмі шырока: *Меневеж, Менькі, Меніца, Мянькоў, Мянькоўскі* і інш.».
- Так, аснову – старабеларускае *мень*, *менек* (літоўскае *ментус*) у значэнні 'назва рыбы наліма' – знаходзім у назвах
- *воз*. *Ме'на* Ушацкага р-на,
- вёсак *Ме'ніца, Мянькі*' Берастаўіцкага р-на,
- *в*. *Меняве'ж* Драгічынскага р-на.

Па меркаванні лекараў,

- рэгулярнае ўжыванне ў ежу печані і мяса **ментуза** спрыяе значнаму зніжэнню рызыкі ўзнікнення сардэчна-сасудзістых і неўралагічных захворванняў.
- Рэчывы, якія змяшчаюцца ў мясе ментуза, паляпшаюць зрок, павышаюць разумовыя здольнасці і агульныя ахоўныя сілы арганізма, дабратворна ўплываюць на стан зубоў і скурных покрываў».

# Акунь

- Назве насельніка азёр, рэк і мораў, што належыць да драпежнікаў, але на самой справе з'яўляецца ўсёедным, *акуню* абавязаны сваім з'яўленнем гідронім *Яку'нька* (рака, якая з'яўляецца прытокам Гаўі сістэмы Нёмана), які ўяўляе сабой трансфармацыю асновы *акунь*, а таксама камонімы *Акунёва* Глыбоцкага і Мёрского р-наў; *Акунёўка* Шклоўскага р-на; *Акуні'нава* Слонімскага р-на.
- І зноў галоўным аказваецца медыцынскі эфект: вядома, што мяса акуня насычана фосфарам, ёдам, бялком і разнастайнымі вітамінамі, якія патрэбны чалавеку для паўнавартаснага развіцця.

# Лешч

- У якасці асновы гідроніма знаходзім і найменне рыбы *ляшча* (гл .: *р. Ле'шча* прыток Дняпра).
- Спрадвеку вядома, што тлушч ляшча ачышчае крываносныя сасуды, а вітаміны, якія змяшчаюцца ў рыбе, спрыяюць умацаванню касцей.

# Сялява

- Нешматлікія таксама і тапонімы, якія маюць у сваёй аснове беларускае найменне рыбы *сялявы* (рус. *ряпушка*)

- (гл .: *воз. Сяля'ва* ў Крупскім р-не, а таксама *в. Сяля'ўшчына* Мінскага і Расонскага р-наў).

# Алень

- Пра рэдкую магчымасць ужываць не толькі ў ежу, а і ў якасці лекаў сведчылі ў мінулым і захоўваюць гэтыя традыцыйныя веды цяпер тапонімы, утвораныя ад найменняў дзікай жывёлы – *аленя* і *мядзведзя*, якіх, відаць, было багата ў Смаргонскім і Магілёўскім раёнах (*в. Аляне'ц, в. Алень*).
- Магчыма, гэтыя назвы пазначалі месцы палявання і г.д.

# Мяса аленя

- У першую чаргу – гэта ежа, не самы распаўсюджаны прадукт, які цяпер лічыцца дэлікатэсам.
- З-за адсутнасці тлушчу мяса вельмі карысна для людзей, якім трэба знізіць халестэрын, а таксама рэкамендуецца пры хваробах страўніка і печані.
- Карысныя ўласцівасці мяса аленя ўнікальныя, з яго вырабляюць лекавыя прэпараты ў выглядзе парашкоў, якія ўжываюць для стымуляцыі палавой функцыі, абароне ад небяспечных канцэрагенаў, насычэння плазмы крыві карыснымі кампанентамі і інш.

# Мядзьведзь

- У аснове назваў *ракі Мядзве'дка,* прытока Ведрычы сістэмы Дняпра, *сёл Мядзве'днае* Ельскага р-на і *Мядзве'жае* Чачэрскага р-на – назва драпежнага буйнога млекакормячага, мяса якога таксама можна ўжываць у ежу.
- Тлушч і жоўць мядзведзяў, як вядома, выкарыстоўвалі раней і выкарыстоўваюць цяпер у медыцыне для лячэння захворванняў печані і жоўцевых шляхоў, нырак, моцных апёкаў.

# Барсук

- Назва яшчэ аднаго дэлікатэса, які карысны і прыемны, але ў невялікіх тэрапеўтычных дозах – мяса і тлушчу *барсука*, –
- таксама трапіла у тапанімікон у выглядзе *в.* *Барсе'ева* (варыянт *Барсе'я*) Лёзненскага р-на.

# Тры прычыны выкарыстання назвы ў тапаніміі:

- 1) у складзе барсучынага мяса прысутнічае цэлы шэраг карысных рэчываў: вітаміны A і E, што адказваюць за ўмацаванне імунітэту; вітаміны групы B – важныя каталізатары абменных працэсаў; вітамін K, дэфіцыт якога ў арганізме прыводзіць да таго, што кроў пачынае горш згортвацца; ненасычаныя тлустыя кіслоты аказваюць станоўчы ўплыў на сэрца і сасуды, не даюць зношвацца іх сценкам і перагародкам;
- 2) вялікую каштоўнасць мае печань барсука;
- Яшчэ ў часы знахароў і шаманаў яна выкарыстоўвалася з мэтай лячэння пераломаў;
- 3) тлушч барсука паляпшае абменныя працэсы, нармалізуе страваванне; умацоўвае імунітэт, стымулюе аднаўленчыя працэсы, таму хутчэй зацягваюцца раны; паляпшае працу сэрца, умацоўваючы сценкі сасудаў; наладжвае сінтэз гармонаў; нават да лепшага змяняе якасць валасоў, пазногцяў і скуры; запавольвае фізіялагічнае старэнне.

# Заключэнне

1. Прыродны і культурны ландшафты знаходзяцца ў непарыўнай сувязі . Чалавек не толькі ўлічвае ўсе асаблівасці прыроднага ландшафту, але і фіксуе яго значныя элементы ў імёнах сваіх рэк, вёсак і гарадоў.

- 2. Колькасныя дадзеныя пацвярджаюць, што пры намінацыі геаграфічных аб’ектаў назвамі жывёльнага свету беларусы ў большасці выпадкаў кіраваліся не толькі праблемамі забеспячэння сябе ежай, а і магчымасцю выкарыстання тканак, органаў і прадуктаў жыццядзейнасці жывёлін у якасці лекаў.
- 3. Клопат пра малую Радзіму, на якой стагоддзямі жылі продкі, перадаючы тэхналогіі захавання прыроды і роду, гэта і ёсць клопат пра ўнікальную спадчыну – традыцыйныя веды, якія ўключаюць у сябе культурную спадчыну, або ‘частку матэрыяльнай і духоўнай культуры, якая створана мінулымі пакаленнямі і передаецца будучым як нешта каштоўнае і ўшанаванае’.
- 4. Назвы геаграфічных аб’ектаў былі і застаюцца адным з асноўных рэпрэзентантаў культуры народа, якія ўвасабляюць назапашаны вопыт, навыкі і перадаюць па спадчыне асноўныя каштоўнасці і перакананні.
- Таму тапонімы, утвораныя ад назваў раслін і жывёлы, могуць разглядацца як складнікі традыцыйных ведаў.
-

# Дзякуй за ўвагу!